# Краязнаўчая газета

№ 14 (835)
Красавік 2021 года

Выдаецца з красавіка 2003 года

kazeta.by bfk.by


## У нумары:


☞ Ушанаванне: *чытальнікі – пісьменніку Уладзіміру Дубоўку –* **стар. 2**

☞ Асобы: *творцы і героі Іўеўшчыны, трактарысткі Бярэзіншчыны –* **стар. 3 і 5**

☞ Ініцыятыва: *папулярызацыя творчасці літаратараў-землякоў –* **стар. 6**


**Пад час абраду «Засеўкі» ў Ваўкавыскім раёне**




## На тым тыдні...

*Ратуемся спадчынай*

✓У рамках **тыдня памяці Хатынскай трагедыі** вучні 9-11 класаў навучальна-педагагічнага комплексу «Дзярэчынскі дзіцячы сад – сярэдняя школа» Зэльвенскага раёна наведалі мемарыяльны комплекс «Шавулічы» і ўшанавалі памяць жыхароў вёскі, якую карнікі спалілі 7 ліпеня 1943 г. Былі расстраляныя 366 жыхароў, з іх – 120 дзяцей. Вёска, што складалася з 77-і двароў, дзе жылі 94 сям'і, перастала існаваць. Расповеды аб жудасных падзеях смуткам ляглі на твары школьнікаў.

✓Спецыяльны **абрад «Засеўкі»** прайшоў на адным з палёў ААТ «Хацькаўцы» Ваўкавыскага раёна. Яго правядзенне, лічыцца паводле старадаўняй традыцыі, спрыяе паспяховаму сельскагаспадарчаму году. Удзельнікі сабраліся ва ўрочышчы «Ашчэльнік». Пачалося дзейства з песні, работнікі Рупейкаўскага Дома культуры звярнуліся да зямліцы з просьбаю аб добрым надвор'і і багатым ураджаі. Дабраславілі земляробаў на плённую працу праваслаўны і каталіцкі святары, асвяцілі поле і насенне, тэхніку і людзей. Дырэктар гаспадаркі Аляксандр Жылінскі павіншаваў з пачаткам палявых прац і падзяліўся планамі іх паспяховага выканання. Потым ён разам з аграномам Станіславам Пінютам, юрыстам Аляксандрам Даўкшам і былой работніцай сельгаспрадпрыемства Валянцінай Міхальчык уручную засеялі першую палоску. Першым засявальнікам на сучаснай тэхніцы стаў адзін з найлепшых механізатараў гаспадаркі Віктар Тоўсцік.

✓На вялікі жаль, гісторыя была бязлітаснай да беларускай культуры, і да нашага часу не захавалася многіх артэфактаў мінуўшчыны. Аднаму з іх прысвечаная выстава **«Узноўлены шэдэўр»**, што адкрылася **30 сакавіка** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Цяпер не засталося амаль ніводнай арыгінальнай дошкі, з якой нашы продкі рабілі цудоўныя гравюры ў XVI – XVIII стст. На выставе ўпершыню, дзякуючы вядомаму бібліяфілу, калекцыянеру гравюраў і экслібрысаў Алегу Судлянкову, дэманструецца ўнікальная гравіравальная дошка XVII ст. і ўзноўленая з яе паводле даўняй тэхналогіі гравюра з партрэтам караля і вялікага князя Яна III Сабескага.

Прадстаўленая медная дошка XVII ст. выкананая ў тэхніцы разцовай гравюры. Гэта адна з найбольш старажытных тэхнік гравіравання на метале, за якой на беларускіх землях замацавалася назва медзярыт. На жаль, сучасныя айчынныя майстры ўжо не працуюць у тэхніцы разцовай гравюры на метале. Аднак да нашых часоў захаваліся дасканалыя беларускія медзярыты, уключаныя ў склад старадрукаў XVII – XVIII стст., найлепшыя таксама прадстаўлены на выставе.

Тэхналогія і друк гравюры паўтораныя мастаком-графікам Віктарам Саўчанкам і прадстаўленыя на выставе ў фармаце відэафільма.

Выстава будзе працаваць у музеі да 30 траўня.

✓У рамках абласнога праекта **«#Мая_Зямля_Прыдняпроўе»** ў Клімавіцкай СШ № 3 прайшоў конкурс «Вандроўка ў мінулае». Навучэнцы актыўна далучыліся да пошуку гісторыка-культурных мясцінаў раёна, у кожным класе былі вызначаныя аб'екты даследавання. Прайшлі ў школе і розныя мерапрыемствы: музейныя заняткі («Саракі», «Як хлеб да стала дайшоў»), імпрэза «Звычаі і традыцыі нашага краю», акцыя «Памяць», экскурсіі па горадзе ды інш. Пешаходную экскурсію ў гарадскім парку правяла супрацоўніца цэнтральнай раённай бібліятэкі Людміла Маслава, якая распавяла пра мінуўшчыну гістарычнага цэнтра Клімавічаў.



✓У рамках фестывалю скульптуры «SculptFest» Беларускага саюза мастакоў **2 красавіка** ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Шчамялёва адбылося адкрыццё выставы **«Парнат. Скульптура»**.

«SculptFest» – маштабны выставачны марафон, што аб'ядноўвае на розных арт-пляцоўках большасць дзейных мастакоў-скульптараў з усёй Беларусі. Праект падрыхтаваны секцыяй скульптуры ГА «Беларускі саюз мастакоў», яго мэта – прадставіць шырокай публіцы творцаў і іх творы, выкананыя ў розных жанрах і матэрыялах, пазнаёміць з новымі тэндэнцыямі ў сучаснай беларускай скульптуры. Асобная экспазіцыя знаёміць з творчасцю выкладчыкаў-скульптараў Гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. Ахрэмчыка (якую неафіцыйна і называюць Парнатам).

Выкладчыкаў-скульптараў аб'ядноўвае не проста праца ў адной навучальнай установе, а любоў да прафесіі настаўніка, адданасць мастацтву скульптуры. Мастакі, поўныя творчых сіл і ідэяў, працягваюць перадаваць досвед і веды малодшым пакаленням.

На выставе экспануюцца яркія прадстаўнікі сучаснай скульптуры, мастакі, якія праявілі сябе ў манументальнай, дэкаратыўнай, паркавай, станковай скульптуры і ў мастацтвазнаўстве. Глядач да 25 красавіка можа пазнаёміцца з амаль 30 творчымі працамі, выкананымі ў розных тэхніках і матэрыялах – ад партрэта да абстрактнай формы, ад рэльефу да круглай скульптуры.

*Скарыстаная інфармацыя з паведамленняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Шчамялёва (Мінск), сайтаў газет «Родная ніва» (Клімавічы), «Праца» (Зэльва), «Наш час» (Ваўкавыск)*

**Сябры, дзякуючы руплівасці ўсіх і кожнага і таму, што выпісваеце «Краязнаўчую газету», яна выдаецца. Давайце ж пашыраць кола чытачоў, аўтараў і падпісчыкаў.**

*Увазе зацікаўленых*

Вясна – выдатны час, каб наводзіць парадак. Гэтым заняліся і мы ў рэдакцыі. І пабачылі, што назапасілася даволі шмат разрозненых асобнікаў «Краязнаўчай газеты» розных гадоў. Таму прапануем чытачам і падпісчыкам:

вы можаце **завітаць да нас у рэдакцыю** (адрас і тэлефон глядзіце на апошняй старонцы газеты), **каб выбраць** сабе (гэта зусім бясплатна) асобнікі, якіх у вас няма альбо якія найбольш зацікавяць.

Чакаем вас, толькі просім загадзя скантактавацца, каб дамовіцца аб часе сустрэчы. Звярніце таксама ўвагу, што рэдакцыя не адбірае асобнікі і не высылае. Чакаем вас цягам месяца, да сярэдзіны траўня.

*Рэдакцыя «Краязнаўчай газеты»*

# Да юбілею «Мілавіцы» кнігу выдалі талакою

Сказаць, што 2020 год быў цяжкім – не сказаць нічога. Гэта пераломны момант у жыцці абсалютна ўсіх. Пэўна, ужо гадоў праз 5 – 10 ён і ўсе падзеі будуць выкладацца ў падручніках гісторыі.




Тым больш шкада, што многа вартага і каштоўнага, да чаго ішла падрыхтоўка не месяц і не год, проста адышло на другі план, сталася незаўважаным.

Так, на жаль, адбылося з юбілеем выдатнага фальклорнага калектыву з Мінска «Мілавіца», які ў 2020 годзе адзначаў свае 30-годдзе. Гэта ў людзей такі ўзрост – яшчэ маладосць і ў некаторых пачатак свайго самастойнага жыцця. А для гурта гэта вельмі сталая дата, дарасці да якой, асабліва ў рэчышчы фальклору, даводзіцца не кожнаму калектыву. Таму гэта мусіла быць сапраўднае вялікае свята! Аднак запланаваныя мерапрыемствы падвіслі ў паветры з вялікім пытальнікам яшчэ пад час першай хвалі COVID-19. А бліжэй да восені стала зразумела, што пытальнік вельмі тлусты і важкі, і ледзь не пераўтвараецца ў крыжык.

На шчасце, адбылася трансфармацыя іншага кшталту: Мікола Аляксеевіч Козенка – выдатны этнахарэограф і выкладчык у калектыве – узяўся за ўкладанне зборніка да юбілею «Мілавіцы». Мінулыя і сучасныя ўдзельнікі гурта і іх бацькі, настаўнікі і натхняльнікі падзяліліся сваімі ўспамінамі і ідэямі. Хтосьці разглядаў ролю «Мілавіцы» ў іх асабістым станаўленні, іншыя разважалі над тым, як дзейнасць калектыву паўплывала на развіццё фальклорнай традыцыі ў краіне. А сапраўды: гэта не проста 30 гадоў навучання спевам ды танцам, за гэты час гурт паўдзельнічаў у адначаленні вялікай колькасці беларускіх абрадаў, тым самым зрабіўшы свой унёсак у тое, каб яны жылі і перадаваліся ад пакалення да пакалення. Разам з тэкстамі і гісторыямі зборнік быў аздоблены фотаздымкамі з розных мясцінаў і імпрэзаў: гэта конкурсы, святы, выступы і проста працоўныя моманты, што яскрава паказваюць прыгажосць самой дзеі, строяў, удзельнікаў.

Варта дадаць, што сам факт існавання гэтай кнігі ў надрукаваным выглядзе – доказ неверагоднай падтрымкі адно аднаго ўдзельнікамі ў калектыве. Бо калі вы разгорнеце кнігу, перад анатацыяй убачыце доўгі спіс вучняў і сяброў «Мілавіцы», фінансавая падтрымка якіх сталася вялікай дапамогай для таго, каб зборнік убачыў свет.

Такім чынам, нягледзячы на ўсе перашкоды, якія чыніліся наўкол, калектыў усё ж атрымаў такі цудоўны падарунак да свайго юбілею. І аўтары спадзяюцца, што кожны, хто возьме гэты зборнік у рукі, знойдзе ў ім нешта для сябе. А можа, і самога сябе!

*Дар'я НЕСЦЯРЭНКА*

# 880 кветачак шыпшыны

***24 сакавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў па выніках Рэспубліканскага анлайн-конкурсу чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», што праводзіўся летась з 1 кастрычніка па 15 лістапада ў рамках праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця». Праект рэалізуецца НББ сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Выдавецкім домам «Звязда» з мэтай адзначыць 100-годдзе ўтварэння Усебеларускага літаратурнага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк». Конкурс, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння пісьменніка Уладзіміра Дубоўкі, Нацыянальная бібліятэка ладзіла сумесна са сваімі інфармацыйнымі партнёрамі – часопісамі «Маладосць» і «Бярозка».***



У конкурсе ўзялі ўдзел 880 чытальнікаў рознага ўзросту з усёй Беларусі, а таксама з-за мяжы (у прыватнасці, з Італіі). Прыемнай нечаканасцю для арганізатараў стаў такі масавы ўдзел і вялікая колькасць творчых працаў высокай якасці. Таму толькі кампетэнтнасць журы і карпатлівая праца аргкамітэта дала магчымасць вызначыць найлепшых з такой вялікай колькасці працаў. Пераможцамі сталі 59 удзельнікаў у 28-і намінацыях.

Пад час імпрэзы перад прысутнымі выступілі намеснік генеральнага дырэктара НББ Беларусі Алесь Суша, сябры журы дацэнт філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ірына Багдановіч і паэтка, перакладчыца, кандыдат філалагічных навук Аксана Данільчык, а таксама дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Сяргей Усік і старшыня Беларускага фонду культуры Тадэвуш Стружэцкі. Мелі слова таксама намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» Дзмітрый Шулюк і галоўны рэдактар часопіса «Бярозка» Кацярына Каплун. Аўтар гэтых радкоў, сябра аргкамітэта, распавяла пра асаблівасці правядзення конкурсу, а бібліятэкар Пастаўскай дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі Людміла Сяменас – пра ўшанаванне памяці пісьменніка на яго радзіме.

Дыпломамі і прызамі былі ўзнагароджаныя:

◈ у катэгорыі 6 – 9 гадоў – Аляксандра Рудэнка (Махоўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Магілёўскага раёна), Станіслаў Сашко (Азярцоўская СШ Мінскага раёна) і Вікторыя Кулік (СШ № 34 г. Бабруйска»);

◈ у катэгорыі 10 – 13 гадоў – Арсеній Астаповіч, Захар Прыбыш, Раман Сасноўскі і Цімур Жырны (Бараўлянская гімназія Мінскага раёна), Ульяна Мурманцава (гімназія № 4 г. Мінска) і Ганна Чамаданава (Сласцёнаўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Чавускага раёна);

◈ у катэгорыі 14 – 17 гадоў – Дар'я Ціханская (Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна), Сяргей Бярозка і Анастасія Феданюк (Дамачаўская СШ Брэсцкага раёна), Ягор Троцкі (Кадзінская СШ Магілёўскага раёна);

◈ у катэгорыі ад 18 гадоў – Марына Мандзік (Мілявіцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Мастоўскага раёна), Аляксандр Матошка (Расонскі цэнтр культуры і народнай творчасці) і Вераніка Сакалова (яслі-сад № 48 г. Магілёва).



Прыз глядацкіх сімпатыяў атрымалі Эліна Рогалева і Іван Скарабагатаў (Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў імя Я. Глебава); прызы сімпатыяў ад часопіса «Маладосць» – Арына Колесава (СШ № 1 імя Героя Савецкага Саюза П.А. Крываноса г. Клічава) і Ягор Кузаўкоў (гімназія г. Дзяржынска); прыз сімпатыяў ад народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова» – Яраслаў Шчэрбаў (Маладзечанская санаторная школа-інтэрнат) і Таццяна Новікава (яслі-сад № 18 г. Магілёва). Асобным пераможцам конкурсу дадаткова былі ўручаныя граматы і памятныя прызы ад Беларускага фонду культуры і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, а таксама запрашальныя білеты на спектакль ад Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Цёплую і шчырую атмасферу вечарыны сваімі творчымі выступленнямі стварылі ўдзельнікі конкурсу і народны літаратурны тэатр «Жывое слова» пад кіраўніцтвам сябра журы Алесі Сівохінай.

Пасля імпрэзы для пераможцаў конкурсу было арганізаванае наведванне Музея кнігі і аглядная пляцоўкі НББ.

Такі актыўны ўдзел і шчырыя творчыя працы нашых удзельнікаў гавораць аб нязменным жаданні беларусаў вывучаць і захоўваць нацыянальную культуру!

*Настасся ЖАРСКАЯ, галоўны бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела НББ*

***ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» віншуюць удзельнікаў і пераможцаў конкурсу і жадаюць моцы, плёну ў далейшым спасціжэнні спадчыны У. Дубоўкі, культурных і гістарычных набыткаў Бацькаўшчыны.***

# Гонар зямлі Івейскай

***У розныя перыяды гісторыі наш край не быў абдзелены таленавітымі людзьмі: публіцыстамі, паэтамі і празаікамі, якія праслаўлялі яго магутнай сілай роднага слова, патрыятычным духам, смелым і ўпэўненым палётам думак у абарону нацыянальных правоў, веры, гонару і годнасці беларускага народа, марамі аб светлай і незалежнай будучыні Беларусі.***

***Іўеўская дзіцячая бібліятэка сумесна з мясцовым краязнаўцам, настаўнікам гісторыі Алегам Ігліцкім распрацавала серыю інфармацыйных бюлетэняў «Вяртаем забытыя імены». Ужо выдадзеныя працы «Чалавек-легенда Аляксандр Сільвашка», «Якаў Жынко – генерал з вялікім сэрцам», «Графы Умястоўскія – лёсы ў гісторыі», «Зофія Ільінская – паэтэса трох народаў», «Тадэвуш Сакалоўскі – алімпіец з Жамыслаўля», «Корвін-Мілеўскія – гонар зямлі Івейскай», «Марыя Чэрнік – жыццё, аддадзенае народу». Выданні багата аздобленыя арыгінальнымі фотаздымкамі, дакументамі, успамінамі. Гэта праўдзівыя гісторыі з жыцця легендарных асобаў, якія пакінулі значны ўклад у гісторыі Іўеўшчыны.***

***Матэрыялы выданняў будуць карысныя ўсім, хто цікавіцца гісторыяй і культурай нашага рэгіёну.***



*Зофія Ільінская*

### *«Зофія Ільінская – паэтэса трох народаў»*

У працы мы расказалі пра жыццё і літаратурную дзейнасць паэтэсы Зофіі Ільінскай (дзявочае прозвішча Брахоцкая), дзіцячыя і юнацкія гады якой прайшлі ў маёнтку Морынь. Цяпер гэта вёска Морына ў Іўеўскім раёне.

У 18-гадовым узросце яна разам з маці і братамі эмігравала ў Англію. У чужой краіне, за Ла-Маншам, З. Ільінская, пераадольваючы жыццёвыя цяжкасці, спаўна раскрыла свой талент журналіста і паэтэсы. Жывучы ў Англіі, яна 53 гады не мела сувязяў з радзімай, дзе ўзрастала. Яе мара наведаць Беларусь ажыццявілася толькі ў пачатку 1990-х, калі ў выніку палітыкі перабудовы была паднятая «жалезная заслона» на Захад. У час яе першага прыезду ў Беларусь у 1992 г. у газеце «ЛіМ» з'явілася падборка вершаў (на беларускую мову пераклаў Р. Барадулін).

Мясцовы краязнаўца, настаўнік гісторыі Алег Ігліцкі (які сам родам з Морына) марыў сустрэцца з Зофіяй, але яму не ўдалося, бо візіты паэткі былі кароткімі. Пасля смерці Ільінскай Алег Міхайлавіч адшукаў адрас яе сваячкі Зофіі Банецкай з польскага горада Торунь і 7 гадоў вёў з ёй перапіску. У выніку і былі здабытыя радаводныя звесткі пра Брахоцкіх, успаміны, фотаздымкі ды іншыя матэрыялы пра паэтэсу. Дзякуючы гэтай працы мы шмат даведаліся пра жыццёвы лёс і літаратурную творчасць нараджэнкі нашага Прынямоння.

Не па ўласнай волі З. Ільінская апынулася ў Англіі. Боль і туга па страчанай радзіме лейтматывам праходзіць праз усю яе творчасць. Паэзія Ільінскай восеньская, сумная, заўсёды настальгічная, як уласныя думкі і перажыванні: «Лістапад, восенню зрабавана, хай ведае смутак выгнанца бядачы...», «Бацянам гэтак добра... Сябра, мы звечарэлі, і таксама б за Нёман...».

З. Ільінская была грамадзянкай Англіі, каталічкай паводле веравызнання, думала і пісала на польскай мове, прышчэпленай ёй бацькамі ў дзяцінстве, а сэрцам і душой любіла Беларусь і марыла да яе вярнуцца. Як журналіст і паэтэса ўнесла значны ўклад у літаратуру і культуру трох краінаў і трох народаў: англійскага, польскага і беларускага.

### *«Чалавек-легенда Аляксандр Сільвашка»*

Сярод шляхоў соцень тысячаў вядомых і безымянных герояў Другой сусветнай вайны пралёг баявы шлях і нашага зямляка Аляксандра Сафронавіча Сільвашкі. Яго біяграфія і праз многія гады пасля перамогі вартая не толькі ўспамінаў, але і асэнсавання, прыкладу для перайманні маладому пакаленню XXI ст. Пра яго мы падрабязна распавялі ў сёлетнім № 6 «КГ».

Звычайны ўкраінскі хлопец, піянерскі і камсамольскі важаты, актывіст, калі Радзіма апынулася ў варожай небяспецы, пайшоў у партызанскі атрад, а потым далучыўся да перадавой часці Чырвонай Арміі, з баямі прайшоў Еўропу, каб не толькі вызваліць сваю краіну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, але і знішчыць карычневую «чуму» ў яе ўласным логаве – Германіі.

Франтавая біяграфія Аляксандра Сафронавіча – яскравы прыклад таго, што ў жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу. Лёс яго склаўся так, што прайшоў усе баявыя выпрабаванні, выжыў і апынуўся на р. Эльбе. Ён першым прагнуў руку амерыканскаму афіцэру-саюзніку Уільяму Робертсану. Гэты поціск рукі сімвалізаваў хуткае і бяспрэчнае заканчэнне вайны. Дастаткова паглядзець на фотаздымак таго незабыўнага моманту, каб пераканацца, колькі ў гэтых байцоў двюх вялікіх дзяржаваў – СССР і ЗША – мужнасці, трываласці, адвагі, не страчаных за гады вайны чалавечнасці і веры ў Перамогу.

У паваенныя гады Беларусь стала другой радзімай для А. Сільвашкі. Ён палюбіў гэтую зямлю, беларускі народ. І назаўсёды застанецца знакамітым беларусам, подзвіг якога ўвайшоў у гісторыю Другой сусветнай вайны.

*Таіса ГРЫКЕНЬ,*
*загадчык аддзела*
*абслугоўвання і інфармацыі*
*Іўеўскай раённай бібліятэкі*

**(Заканчэнне будзе)**

# Помнік Елісею Лаўрышаўскаму

У рамках супрацоўніцтва з Беларускай Праваслаўнай Царквой выхаванцы Навагрудскай спецыяльнай школы-інтэрната для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, парушэннямі псіхічнага развіцця, цяжкасцямі ў навучанні здзейснілі чарговую адукацыйную экскурсію ў мэтах наведвання аднаго з самых цікавых аб'ектаў праваслаўнай культуры Навагрудскага раёна – помнік Елісею Лаўрышэўскаму.



Увосень 2007 г. на старажытную навагрудскую зямлю спусціўся з далёкага мінулага велічны Елісей Лаўрышаўскі. Духоўна-асветніцкая дзейнасць прападобнага з'яўляецца прыкладам служэння Богу і праваслаўным каштоўнасцям, натхняе на высакародныя справы ў імя дабра і міласэрнасці. Елісей быў заснавальнікам Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра, што з'яўляўся апорай у праваслаўнай сінхранізацыі і быў узведзены ў далёкім XII ст. На беразе Нёмана ў аддаленых месцах ад людзей, сярод лясоў і балотаў пачаў свой подзвіг святы Елісей.

Прападобны Елісей Лаўрышаўскі нарадзіўся ў сям'і літоўскага князя Трайната. Яго дзіцячыя і юнацкія гады праходзілі ў сям'і багатых і ўплывовых бацькоў. Елісей атрымаў добрую адукацыю, што дазваляла яму знаходзіцца ў вышэйшых пластах тагачаснага грамадства. Дасягнуўшы паўналецця, ён паступіў на службу пры двары вялікага князя Міндоўга. Зносіны з выдатнымі людзьмі таго часу прывялі юнага Елісея да знаёмства са святцелем Лаўрэнціем Тураўскім, які пасля стаў яго духоўным бацькам і настаўнікам. Духоўныя гутаркі са святым старцам заахвоцілі Елісея змяніць свой лад жыцця.

Нашы выхаванцы пад час экскурсіі даведаліся, што Елісей прыняў святое хрышчэнне, пакінуў княскі двор і адышоў у 1225 г. у пустыню, дзе на ўласныя сродкі будаваў манастыр – Лаўру. Дзеці з цікавасцю даведаліся, што ў XIII ст. манастыр, заснаваны прападобным Елісеем, быў духоўным і культурным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага. Тут вёўся летапіс. Пад яго кіраўніцтвам было напісанае знакамітае Лаўрышаўскае Евангелле, створаная бібліятэка.

Многае змянілася з тых часоў, аднак нязменным застаецца тое, што беларуская зямля мае вялікага малітоўніка і заступніка перад Богам – прападобнага Елісея Лаўрышаўскага. У 1997 г. мясцовымі ўладамі было дазволенае будаўніцтва царквы-помніка на месцы старажытнага манастыра. У 2000 г. храм быў пабудаваны і асвечаны ў гонар прападобнага Елісея Лаўрышэўскага, памяць якога адзначаецца 5 лістапада. Кожнаму жыхару Навагрудскага раёна вядома, што цягам некалькіх стагоддзяў наш горад быў не толькі важным дзяржаўна-палітычным, але і рэлігійна-культурным цэнтрам. Духоўныя традыцыі Навагрудчыны працягваюцца і сёння. Некалькі гадоў таму была адноўленая Навагрудская праваслаўная кафедра. Вядзецца старанная праца па духоўна-маральным выхаванні падрастаючага пакалення, аднаўляюцца і будуюцца новыя храмы. Помнік прападобнаму Елісею Лаўрышаўскаму ў Навагрудку быў адкрыты 10 лістапада 2007 г., яго асвяціў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Трохметровы манумент святога ў манаскім уборы і з крыжом у руках усталяваны на вуліцы Гарадзенскай каля будынка епархіяльнага ўпраўлення. Адкрыццё манумента стала адной з цэнтральных падзеяў святкавання 690-годдзя абвяшчэння Навагрудскай епархіі і 15-годдзя яе аднаўлення, што праходзілі пад час урачыстасцяў у гонар 1015-годдзя праваслаўя на Беларусі. Посах у руках Елісея з'яўляецца своеасаблівым запаветам, які нясе святы праз стагоддзі будучым пакаленням: заўсёды, што б ні здарылася, у любую хвіліну, стаць на абарону сваёй Радзімы, прайшоўшы праз смерць і самаахвяраванне.

Экскурсія атрымалася вельмі насычанай і карыснай, бо ў сённяшні час, калі адбываецца пераасэнсаванне многіх гістарычных падзеяў, без вывучэння гісторыі і святыняў роднага краю немагчыма ў поўнай меры рэалізаваць задачы маральна-патрыятычнага выхавання.

*Вольга РАДЧАНКА,*
*выхавальнік, кіраўнік*
*аб'яднання па інтарэсах*
*«Мая Бацькаўшчына»*
*Навагрудскай спецыяльнай*
*школы-інтэрната для дзяцей*
*з цяжкімі парушэннямі*
*маўлення, парушэннямі*
*псіхічнага развіцця,*
*цяжкасцямі ў навучанні*

## Талака за гістарычнае і культурнае адзінства

# Рабіны, якія праславілі Зецела

***(Заканчэнне. Пачатак у № 13)***

Рабін Кранц набыў вядомасць як прапаведнік, які надаваў сваім пропаведзям форму прыпавесцяў (прытчаў). Гэта дазваляла данесці самыя складаныя філасофскія канцэпцыі да любога слухача, нават самага непадрыхтаванага.

Рабін **Якаў бар Зееў Кранц** (Магід з Дубна; 1741 – 1804) – вядомы даршан (грамадскі прапаведнік) – нарадзіўся таксама ў мястэчку Зецела.

Вучыўся ў свайго бацькі, Зеева Кранца, зецельскага рабіна. Ужо ў юнацтве ён ведаў на памяць шэраг трактатаў Талмуда. Выступаў у сваім мястэчку з публічнымі тлумачэннямі Торы.

Калі Кранцу было васямнаццаць гадоў, ён упершыню наведаўся ў Вільню і пазнаёміўся з Віленскім Гаонам (рабін, кабаліст і грамадскі дзеяч, адзін з выбітных духоўных аўтарытэтаў артадаксальнага яўрэйства Эліяху бен Шлома Залман, 1720 – 1797 гг. – **«КГ»**). Ён прадставіў вялікаму мудрацу некалькі сваіх самастойных адкрыццяў, зробленых пры вывучэнні некаторых фрагментаў Танаха і мідрашэй. Віленскі Гаон высока ацаніў прапанаваны юным госцем падыход да вырашэння праблемаў, і з таго часу паміж імі ўсталяваліся асабліва цёплыя стасункі.

Сустрэча з Гаонам абудзіла ў юнаку гарачае імкненне да святасці і паклала адбітак на ўвесь яго лад жыцця. Пачынаючы з васямнаццаці гадоў і да канца сваіх дзён ён прачынаўся заўсёды апоўначы, ішоў у Дом Вучэння і там босы, седзячы на падлозе, як у дзень Дзявятага ава, чытаў Цікун хацот – паўночную малітву, у якой аплакваецца разбурэнне Храма. На золку ён акунаўся ў святыя воды міквы нават у халодныя дні…

Неўзабаве пасля наведвання Вільні Якаў ажаніўся і пасяліўся ў г. Мяжырычы, дзе жыла сям’я цесця. Займаючыся ў Доме Вучэння, ён даваў для найбольш адораных юнакоў урокі, а па святах і ў шабат выступаў перад усёй суполкай са сваімі тлумачэннямі Пяцікніжжа і пропаведзямі.

Цесць узяў Якава кампаньёнам у сваю справу, і таму ў маладога даршана была магчымасць выкладаць Тору, не беручы ўзнагароды за сваю працу. Аднак праз два гады цесць збяднеў, і Якаву давялося стаць вандроўным даршанам. Ён пераходзіў з мястэчка ў мястэчка і з горада ў горад, выступаючы ў сінагогах перад суполкамі.

У перыяд гэтых блуканняў склаўся ўнікальны стыль выступленняў, што вылучае рабіна Якава Кранца з мноства іншых прапаведнікаў. Асновай яго тлумачэнняў станавіліся дасціпныя прыпавесці, пабудаваныя, як правіла, на матэрыяле народнага жыцця, добра знаёмай слухачам. Яго прыпавесці дапамагалі ўбачыць праблему глыбей і вырашыць яе нечакана проста і лёгка. Дзякуючы такому падыходу, вельмі складаныя пытанні станавіліся яснымі і даступнымі для разумення.

Заклікаючы слухачоў да праведнага жыцця, Якаў не запалохваў іх карамі і не звяртаўся да тэатральных воклічаў, уласцівых шматлікім іншым даршанам. Ён зачароўваў сэрцы сваімі апавяданнямі, а затым раптам падводзіў слухачоў да тых высноваў, што непазбежна вынікалі з выкладзеных ім прыпавесцяў.

Пад час вандровак рабін Якаў абышоў не толькі многія раёны Беларусі, Польшчы і Украіны, але і пабываў у Нямеччыне, у тым ліку і ў Берліне, дзе сустракаўся з Давідам Фрыдлендарам, адным з лідараў «асветнікаў».

Пасля шматгадовых падарожжаў рабін Якаў пасяліўся ў г. Дубна на Валыні. Ён стаў гарадскім магідам, выступоўцам з публічнымі ўрокамі ў сінагозе. Штодня ён даваў урок па Талмудзе, а затым, да вячэрняй малітвы, выступаў перад усёй суполкай з тлумачэннямі Торы і этычнымі павучаннямі, у якія па-майстэрску ўплятаў свае прыпавесці.

Магід з Дубна быў адзіным чалавекам, да якога Віленскі Гаон звяртаўся з сяброўскімі пасланнямі (Гаон настолькі цаніў кожнае імгненне, што не пісаў у расстанні нават уласным сынам).

У 1791 годзе рабін Якаў атрымаў ліст, у якім Гаон пісаў: «Я прашу, любячы цябе ўсёй душой, наведаць мяне… Вось ужо трынаццаць гадоў, як ты ў мяне не быў, і цяпер мая душа імкнецца ўбачыць цябе».

Рабін Якаў неадкладна адправіўся ў Вільню і на ўсім шляху не зрабіў ніводнага прыпынку для адпачынку. На працягу многіх месяцаў ён даглядаў хворага Гаона і вучыўся з ім разам.

Прайшло пяць гадоў. Гаон пераждаў цяжкую хваробу, але адчуваў сябе дрэнна. Ён яшчэ раз паклікаў Кранца да сябе. Атрымаўшы ліст, Якаў назаўжды пакінуў Дубна, дзе правёў каля васямнаццаці гадоў, і вярнуўся ў Вільню да Гаона.

Засталіся ўспаміны пра тое, што родныя Віленскага Гаона, занепакоеныя станам яго здароўя, папрасілі Якава паўплываць на вялікага мудраца, якому, па меркаванні лекараў, былі жыццёва неабходныя спакой і адпачынак. У сяброўскіх гутарках, абмяркоўваючы з Гаонам вельмі складаныя праблемы Торы, рабін Якаў часта звяртаўся для аргументацыі да сваіх прыпавесцяў, многія з якіх нараджаліся проста ў ходзе дыскусіі, яны былі дасканалыя па форме і заўсёды раскрывалі сутнасць праблемы.

Захаваліся сведчанні, што Гаон, уражаны мастацтвам Якава, спытаў: «Як табе ўдаецца імгненна ствараць выдатныя прыпавесці, дакладна адпаведныя тэме, што абмяркоўваецца?»

І Якаў адказаў на пытанне такой прыпавесцю. Адзін кароль вельмі захапляўся стральбой з лука. І вось аднойчы, праходзячы праз векавую дуброву, кароль убачыў, што на многіх дрэвах былі намаляваныя мішэні і ў кожнай з мішэняў, якраз пасярэдзіне, тырчала страла. Уражаны кароль адшукаў удалага стралка і спытаўся ў яго: «Скажы, прыяцель, якім чынам табе ўдаецца кожны раз трапляць у сярэдзіну мішэні? Я таксама вопытны стралок і ўсё ж часам дапускаю промах». «Усё вельмі проста, Ваша Вялікасць, – растлумачыў стралок. – Вы, напэўна, спачатку размяшчаеце мішэнь, а потым стараецеся трапіць у сярэдзіну. Я ж раблю наадварот – спачатку страляю, а потым малюю мішэнь вакол таго месца, куды ўваткнулася страла. Вось таму ў мяне ніколі не бывае промахаў».

– Гэтак жа і я, – растлумачыў Магід з Дубна сутнасць свайго метаду. – Спачатку я імкнуся адшукаць рашэнне праблемы, і толькі пасля таго, як яно становіцца мне зусім ясным, я малюю вакол «мішэнь» – прытчу, дакладна прыдатную да майго «стрэлу».

Пасля смерці Віленскага Гаона ў 1797 годзе рабін Якаў быў на працягу двух гадоў магідам у польскім горадзе Холм, а затым да канца жыцця – у Замосці, на поўдзень ад Холма (пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795-м гэтыя гарады адышлі да Аўстрыі).

Рабін Якаў Кранц, Магід з Дубна, памёр у Замосці ў 1804 годзе.

Потым яго прыпавесці і тлумачэнні Торы былі выдадзеныя па чарнавых запісах, зробленых ім, а таксама па ўспамінах яго вучняў. Прыпавесці, у якіх тлумачыўся тэкст Пяцікніжжа, сабраныя ў кнізе «Аэль Якаў» (шацёр Якава) і Мішлен Якаў (прыпавесці Якава), а прыпавесці, што адносяцца да «пяці скруткаў», увайшлі ў зборнік «Калі Якаў» (Голас Якава). Яго этычныя навучанні і пропаведзі склалі кнігу «Сеферамідот» (Кніга аб якасцях характару), якая стала адным з шэдэўраў літаратуры яўрэйскай этыкі.

Сёлета ў лютым споўнілася 280 гадоў з дня нараджэння Якава Кранца, нашага земляка. І хоць не захавалася выява яго аблічча, памяць пра мудрага прапаведніка жывая.

***Алена АБРАМЧЫК,***
*старшы навуковы супрацоўнік Дзятлаўскага гісторыка-краязнаўчага музея*



*Ешыва ў Радуні*

### *Таму й прашу, каб зберaглі*

У даўніне вякоў глыбокай
Той першы братка-беларус
Рабіў свае зямныя крокі
І, церабіўшы пальцам вус,

Каб хлеб здабыць сабе надзённы
Ці рыбу ў возеры злавіць,
Ці ў грамадзе сваёй штодзённа
Што-небудзь проста гаварыць,

Пачаў шукаць якое слова,
Каб гэтым дзею абазначыць.
А дзесь жыла ўжо наша мова,
Што пошук чалавечы бачыць.

Вось і пайшла сама ў людзі,
Праз лес дрымучы, пыл эпох…
Хоць разумела: цяжка будзе
Ёй крочыць між такіх дарог,

Дзе слоў чужых віры кружылі,
Наймодных, зразумелых лепш,
Што мове той ліліся ў жылы,
Каб быў нібыта лепшым верш.

І мова родная стагнала,
Яна хацела быць сабой!
А як жа цяжка выжывала,
У сябе хаваючы той боль!

Яна і сёння не ў пашане.
А як шкада! Душа баліць…
Ну, быццам бы і не ў загане,
Ды не на покуці сядзіць.

Яна змяняецца, знікае,
На змену іншыя прыйшлі,
А гэта ж спадчына святая
Святой жа, роднае зямлі!

А каб жыла заўжды між намі,
Каб разумець і размаўляць,
Бо йшла да нас яна вякамі,
Патрэбна мову шанаваць!

І не губляць у вечнасць словы,
Што з даўніны такой ішлі –
Бо гэта ж наша, наша мова!
Таму й прашу, каб зберaглі!

*Валянціна БАБКО-АЛЯШКЕВІЧ,*
*в. Радкава, Салігорскі раён*

# Трактарысткі – каралевы МТЗ

***Механізатары ў вялікай пашане ў сельскагаспадарчай вытворчасці, без перабольшвання – першыя людзі на вёсцы. Прафесія механізатара традыцыйна лічыцца мужчынскай, аднак у ёй прасочваецца і жаночы след.***

***У 1930-я гг. у савецкай краіне грымеў заклік «Жанчыны, на трактар!». Прыкладам для іншых служыла арганізатар жаночай трактарнай брыгады, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Паша Ангеліна, у гонар якой у 1973 г. Міністэрствам сельскай гаспадаркі СССР і ЦК прафсаюзаў быў зацверджаны Усесаюзны прыз працоўнай славы з барэльефам праслаўленай трактарысткі. Штогод у СССР прысуджвалі 30 такіх прызоў з грашовай прэміяй у памеры 300 рублёў для ўшанавання жанчынаў-механізатараў.***

***І на нашай Бярэзіншчыне былі жанчыны са спецыяльнасцю трактарыстак. Іх імёны трывала ўвайшлі ў гісторыю раёна.***



*Людміла Краўцова*

## Зямельку-маці любіла бясконца

У канцы 1930-х самы масавы сельскагаспадарчы трактар у СССР СТЗ-15/30 (яго яшчэ называлі СТЗ-1) асвоіла дзяўчына, ураджэнка вёскі Журоўка Вольга Бандарчык (у замужжы Палігенька). Яна была старэйшай у сям'і, дзе выхоўваліся яшчэ тры хлопчыкі. Сям'я вяла аднаасобную гаспадарку: мела сваю зямлю, каня, дзве каровы, пчолаў. Аднак, калі дзяўчынцы не было і 10 гадоў, застрэлілі бацьку Марка Антонавіча, і матулі давялося пайсці ў мясцовы калгас «Чырвоны перадавік». Дзяўчына скончыла 3 класы Журоўскай і 2 класы Пагосцкай школаў і пакінула вучобу: далёка хадзіць ды і дома трэба было дапамагаць па гаспадарцы. Матуля Ганна Іосіфаўна гатавала ежу для механізатараў Бярэзінскай МТС. На трактары вяскоўцы глядзелі, як на нейкі незвычайны цуд, а калі машынай кіравала жанчына, то было гэта цудам удвая!



*Вольга Бандарчык*

Сярод механізатараў была дзяўчына-трактарыстка Таня. Вольга ўбачыла яе на трактары і загарэлася жаданнем пракаціцца на дзіўнай машыне. Трактары тады былі цалкам металічныя, нават сядзенне, а на колах замест гумавых шынаў былі жалезныя грунтазачэпы. Кіраваць такой машынай жаночым рукам было няпроста. Калі Вольга села за рычагі трактара, ёй так спадабалася, што дзяўчына вырашыла стаць трактарысткай. Яна прыйшла ў Бярэзінскую МТС (дзейнічала ў вёсцы Пагост з красавіка 1934 г.), правучылася 3 месяцы, здала экзамены. І мара 17-гадовай дзяўчыны ажыццявілася. Вольгу прызначылі на трактар напарніцай да Сямёна Ермаловіча. Ён быў адкрыты, добразычлівы, дзяліўся ведамі са сваёй вучаніцай. Кемлівая дзяўчына хутка схоплівала механізатарскія прамудрасці і хутка стала вядомай ва ўсім наваколлі.

Калі прыехаў вярбоўшчык з Крыма, Вольга вырашыла не сядзець у запечку. Беларуская дзяўчына апынулася за 3 км ад Еўпаторыі ў дзявочай трактарнай брыгадзе, затым працавала ў суседнім калгасе на калёсным і гусенічным трактарах. Звязала лёс з маладым сімпатычным трактарыстам з Украіны Рыгорам Палігеньскам…

Чэрвеньскім вечарам 1941 г. Вольга працавала ў начную змену. Непадалёк быў аэрадром, да гулу самалётаў ужо прызвычаіліся, таму ажыўленне ў небе не насцярожыла. А ўдзень трактарыстка даведалася, што пачалася вайна.

Вяртанне да мірнай працы механізатара было доўгім і пакутлівым: канцлагер у Аўстрыі і Венгрыі, страта мужа на фронце, засуха і голад ва Украіне, вяртанне да матулі ў Журоўку… Вользе прапанавалі перасесці на нікому невядомы ў калгасе зернеўборачны камбайн (збожжа ў той час жалі сярпамі). Зямлячка адправілася на курсы і ў Смілавічах за кароткі тэрмін авалодала складанай тэхнікай. Шчыравала ў Бярэзінскай МТС на новенькім камбайне. Калі пачалася цаліная эпапея, бярэзінская жанчына-механізатар працавала ў Казахстане на новай мадэлі трактара МТЗ-50. Пасля вяртання на Бярэзіншчыну ветэран працы В. Палігенька жыла ў Вяшэўцы. Называла вёску сваёй калгаснай Бразіліяй, зямельку-маці любіла бясконца.

## Ген механізатара

Усё жыццё цягнецца раман з трактарам у нараджэнкі вёскі Пагост Таццяны Захожай. За 45 гадоў працы трактарысткай яна змяніла 15 машын. У скарбонцы яе працоўнай славы – імянны чырвоны трактар, ордэн «Знак гонару», 2 медалі ВДНГ СССР, званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола БССР. Усесаюзны прыз працоўнай славы на той час механізатару саўгаса «Камунар» асабіста ўручыў міністр сельскай гаспадаркі СССР Валянцін Месяц па выніках працы за 1981 г., калі Захожая атрымала лепшы на Міншчыне ўраджай бульбы.

Ген механізатара абудзіўся ў Таццяны рана. Калі пасля васьмі класаў Пагосцкай школы Таццяна заявіла, што хоча пайсці вучыцца ў ПТВ на трактарыста-машыніста, маці дачку адгаворваць не стала: з такой прафесіяй без хлеба не застанешся.

Трактарыст-машыніст шырокага профілю Т. Захожая працавала ў Барысаўскім раёне на МТЗ-50, на гусенічным трактары Т-74, потым вярнулася ў родную вёску, дзе шчыравала 16 гадоў. На абласных спаборніцтвах аратых Таццяна заняла першае месца сярод жанчынаў, на рэспубліканскіх – 3-е. За прызавыя месцы выдзялялі трактары з прычэпамі. Амбіцыйная трактарыстка марыла трапіць на Усесаюзныя спаборніцтвы, ды развалі ўся Савецкі Саюз. У 1990-я гг. Т. Захожая пераехала ў Дзяржынскі раён. Цяпер яна – адна з самых вопытных механізатараў сельскай гаспадаркі «Путчына». 15 гадоў як пенсіянер, але на заслужаны адпачынак не збіраецца. Сёння імя жанчыны-механізатара належыць усёй краіне: «Ганаровы грамадзянін Мінскай вобласці» (2017), «Чалавек года Міншчыны» (2016), «Жанчына года» ў намінацыі «За адраджэнне вёскі» (2014). Глыбока пусціла трактарыстка карані ў прафесію – і па сёння збірае ўраджай.




*Таццяна Захожая*

## Цяжкая праца, не жаночая

Трыццаць з гакам гадоў аддала любімай прафесіі Людміла Краўцова. Яе стаўленне да тэхнікі заўсёды было паважлівым. А вось на трактар дзяўчыну, ураджэнку Магілёўшчыны, загнала крыўда. Маці гадавала дачку адна, Людміла – найпершая матуліна памочніца, з маленства навучылася касіць, араць, баранаваць. Неяк вясковы трактарыст адмовіў матулі ў просьбе прывезці дровы. Людміла заявілася да трактарыста і строга спытала дарослага дзядзьку: «Колькі вы будзеце здзекавацца з маёй мамы? Дазвол на трактар ёсць, паперка на аплату – ёсць. Чаму адмовіліся прывезці дровы? Вось-вось снег ляжа, нам што, замярзаць? А ну, паехалі!». Мужчына памягчэў: «Добра! Лезь у кабіну, паедзем!». Па дарозе яны разгаварыліся. Людміла папрасіла «паруліць». Ненадоўга саступіўшы ёй месца, трактарыст расказаў, што і як трэба рабіць. І тут жа мусіў прызнаць: «Малайчына! На ляту ловіш… З цябе добры трактарыст атрымаўся б». Менавіта тады дзяўчына падумала, як добра будзе авалодаць тэхнікай: нікому не трэба кланяцца, не трэба прасіць дапамогі. І паехала пасля школы ў Слаўгарадскае СПТВ. Матуля перажывала за выбар дачкі: цяжкая праца, не жаночая. Але калі тая пасля вучобы пад'ехала да хаты на сталёвым кані, трывога змянілася на гонар. Ды і новыя падставы для яго ўвесь час з'яўляліся: то добрыя словы ў адрас прыгажуні-трактарысткі ад людзей, то граматы і прэміі ад начальства, то здымкі ў газетах…

Чарнобыльская віхура вымусіла дзяўчыну пакінуць родную вёску, і Людміла апынулася ў саўгасе «Любушанскі» Бярэзінскага раёна. Затым рупілася ў мехатрадзе Бярэзінскага райаграсэрвіса. Па стараннi і руплівасці, уменні абыходзіцца з тэхнікай і акуратнасці, цярплівасці і настойлівасці Л. Краўцова не саступала вопытным механізатарам-мужчынам. І цяжкая праца на трактары не пазбавіла яе жаноцкасці і прываблівасці.

Нашыя жанчыны-механізатары – яркі прыклад высокага служэння абранай справе, шчырай адданасці роднай зямлі і вёсцы – свайму духоўнаму апірышчу.

*Тамара КРУТАЛЕВІЧ,*
*загадчык аддзела маркетынгу Бярэзінскай раённай бібліятэкі*

# Выклік чытачам

У лютым – пачатку сакавіка ў Ганцавіцкай раённай бібліятэцы праходзіў краязнаўчы літаратурны чэлендж, прысвечаны літаратарам-землякам.

Цяпер краязнаўчыя кніжныя чэленджы набываюць папулярнасць у працы бібліятэк. Шэраг кніжных літаратурных чэленджаў арганізавала Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Менавіта метад работы галоўнай кніжнай скарбніцы краіны быў пакладзены ў аснову і нашай працы па стварэнні краязнаўчага чэленджа. Мэта яго – папулярызацыя чытання і творчасці літаратараў-землякоў пасрэдніцтвам сайта бібліятэкі, сацыяльных сетак.

Першы крок – гэта рэклама праекта. Была створаная рэкламная лістоўка, дзе размешчаныя ўмовы прыняцця ўдзелу ў «чытацкім марафоне» (можна і так назваць гэты праект, замяняючы нязвыклае для простага абывацеля замежнае слова «чэлендж»). У раённай газеце «Савецкае Палессе» быў змешчаны артыкул «Кніжны чэлендж», дзе мы распавядалі пра творчасць літаратараў-землякоў, заклікалі жыхароў Ганцавіцкага раёна прыняць удзел у праекце, пазнаёміцца з творчасцю пісьменнікаў, якія з шчырай любоўю пісалі пра наш край, апявалі родныя сэрцу пейзажы, услаўлялі чалавека працы. Каму, як не нам, жыхарам раёна, павінна быць блізкай такая літаратура?

На сайце бібліятэкі, у сацыяльных сетках Аднакласнікі, Фэйсбук, Інстаграм, Укантакце размясцілі рэкламу. Менавіта ў сацыяльных сетках, па ўмовах конкурсу, удзельнікі павінны былі на кожную прачытаную кнігу змяшчаць водгукі. Распрацавалі пяць тэмаў і для палёгкі пошуку літаратуры змясцілі ў кожнай з іх па некалькі твораў. Але калі чытач знаходзіў кнігу, не пазначаную ў тэме, то гэта толькі адабралася. Пераможцам конкурсу лічыўся той, хто з кожнай тэмы прачытае па творы і абавязкова пакіне водгук у сацыяльных сетках. Не ўсе ўдзельнікі дайшлі да канца марафону, пераможцамі сталі пяць чалавек. Для ўзнагароджвання пераможцаў падключылі партнёраў, якія бездакорна прапанавалі правесці экскурсію ў раённым краязнаўчым музеі, наведаць музычнае шоу ў доме культуры, спектакль узорнага лялечнага тэатра «Усмешка» ды інш.

Удзельнікаў было толькі дзевяць чалавек і, на першы погляд, можа здавацца, што гэта невялікая колькасць.


*Ганне Севасцьянчык, адной з пераможцаў, уручаецца падарунак, падрыхтаваны Домам рамёстваў*

Але давайце паразважаем. За час кніжнага марафону імі было прачытана болей за 30 кніг літаратараў Ганцавіччыны. А можа, гэта лічба і большая – мы прааналізавалі колькасць водгукаў на прачытанае ў сацыяльных сетках. Магчыма, хтосьці не паспеў занатаваць свой водгук на прачытаную кнігу. Удумайцеся – 30 твораў! Кожны, хто дакрануўся да творчасці літаратараў-землякоў, атрымаў не толькі задавальненне ад прачытанага, але на гэтым, хутчэй за ўсё, не спыніцца, бо сустрэўся з сапраўдным мастацкім словам.

Першая спроба правядзення краязнаўчага літаратурнага чэленджа адбылася, і мы атрымалі станоўчыя вынікі. Аб гэтым сведчаць водгукі чытачоў. Надзея Матусевіч выказала бібліятэкарам удзячнасць: «Дзякую, што нам не даяце сумаваць! Было вельмі цікава пазнаёміцца з некаторымі раней нечытанымі творамі землякоў і даказаць самой сабе, што здолею паспець прачытаць намечанае. Хацелася не прыпыніцца, прайсці кніжны марафон да фінішу». А адзін з старэйшых чытачоў выказаў недавер да новай формы работы бібліятэкі: «Магчыма, прыняў бы ўдзел, але каб не гучала іншамоўная фраза "чэлендж"». Што адказаць? Час не стаіць на месцы, у нашым слоўніку з'яўляецца ўсё болей іншамоўных словаў. Прызвычаіліся ж мы да такіх словаў, як маркетынг, дасье, дысплей, брэнд, логін, хакер, то паступова папоўніцца слоўнікавы запас і такім словам, як «чэлендж», што ў перакладзе на беларускую мову азначае – «выклік».

Літаратурны краязнаўчы чэлендж на гэтым не прыпыняецца. Сёлета ў жніўні мы будзем адзначаць 95-годдзе пісьменніка, імя якога з гонарам носіць раённая бібліятэка. Распрацоўваем наступны чэлендж да юбілею Васіля Праскурава. Хацелася б, каб падключылася большае кола чытачоў да новага праекта – прадстаўнікі кіраўніцтва райвыканкама, арганізацыяў і ўстановаў раёна. В. Праскураў амаль 20 гадоў узначальваў раённую газету «Савецкае Палессе», быў сапраўдным кіраўніком, цудоўным журналістам, Чалавекам з вялікай літары. Павучыцца чалавечнасці можна ў яго і сёння, гартаючы старонкі праскураўскіх кніг.

Хочацца звярнуцца да нашых чытачоў. Кнігі літаратараў-землякоў, на жаль, зараз рэдка перавыдаюцца. Мы беражна ставімся да кожнага кніжнага экзэмпляра ганцавіцкіх літаратараў, гэтыя творы з'яўляюцца найбольш каштоўнымі ў бібліятэчным фондзе. Мы дорым цудоўную магчымасць землякам дакрануцца да гэтай жывой крыніцы літаратурнага мастацтва. Не ўпускайце гэты шанец і – да новых сустрэч, да новых выклікаў самому сабе!

*Таццяна МАЛЯЎКА, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя В.Ф. Праскурава*

# Кожнае жыццё – каштоўнасць

***На Пастаўшчыне 21 сакавіка мітынг-рэквіем, прымеркаваны да Дня памяці ахвяраў Хатыні, сабраў на месцы былой вёскі Альцы – сястры Хатыні – усіх, у чыім сэрцы адгукаецца боль трагедыі часоў Вялікай Айчыннай вайны: прадстаўнікоў улады, грамадскіх аб'яднанняў, культуры, духавенства, моладзь.***

На 21-м падворку, дзе калісьці віравала жыццё і гучаў дзіцячы смех, сёння ўзвышаецца помнік у выглядзе печы з комінам. Ён такога ж шэрага колеру, як і попел, у які ператварылі карнікі 72-х мірных жыхароў вёскі, спаленых жывымі ў студзені 1943 года. Памяць пра ахвяры ўшанавалі хвілінай маўчання. Да помніка ляглі кветкі.

– *Вялікая Айчынная вайна прынесла на нашую зямлю вялікае разбурэнне, забрала жыцці мноства землякоў. 186 беларускіх вёсак, знішчаных разам з жыхарамі, так і не змаглі аднавіцца,* – адзначыў старшыня раённага Савета дэпутатаў Пётр Курто. – *Наша задача – ніколі не забываць пра нечалавечыя зверствы, якія ўчынялі нямецка-фашысцкія захопнікі, шанаваць памяць пра бязвінных ахвяраў, перадаваць яе з пакалення ў пакаленне.*

Перад малітваю за ўсіх загінулых ксёндз-дэкан дунілавіцкага касцёла Павел Самсонаў заклікаў прысутных вынесці з гісторыі правільны ўрок: прызнаваць каштоўнасцю кожнае чалавечае жыццё, умець любіць, прабачаць, а ўсе канфлікты вырашаць толькі мірным шляхам. *«Нашы суайчыннікі годна вытрымалі выпрабаванні, якія выпалі на іх лёс. Увесь свет можа павучыцца цярпенню і спагадлівасці беларускага народа,* – лічыць святар. – *Памятайце: любоў і прабачэнне – найвялікшая ўзнагарода для кожнага хрысціяніна».*

Прагучалі апошнія словы малітвы; падхопленая ветрам, яна ўзнялася ў неба, а ўдзельнікі мітынгу-рэквіема яшчэ некаторы час моўчкі стаялі каля дагледжанага помніка. Вакол яго парадак і чысціня – заўсёды. Чарговы працоўны дэсант пашчыраваў тут напярэдадні ў рамках патрыятычнага праекта «Сёстры Хатыні», ініцыяванага Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. Удзельнічалі актывісты арганізацыі з Дунілавіцкай СШ, іх настаўнікі, прадстаўнікі райкама БРСМ і цэнтральнага каманднага пункта войскаў ВПС і СПА прыбралі сухое лісце і галлё.

*Вераніка ФІЛАНОВІЧ, г. Паставы*
*Фота Наталлі НАЛЕЙ*






# Пярэстая мазаіка з айчынных сцежак

Імя Аляксея Шалахоўскага вядомае многім людзям, якія цікавяцца беларускай гісторыяй і культурай. Яго артыкулы і рэпартажы часта з'яўляюцца на старонках «Нашага слова», «Краязнаўчай газеты», «ЛіМа» і іншых выданняў. У сферу зацікаўленняў А. Шалахоўскага трапляюць мастацкія імпрэзы, прэзентацыі, падзеі грамадскага і культурнага жыцця, новыя кнігі беларускіх аўтараў. Такая «спецыялізацыя» грунтуецца на адпаведнай адукацыі: гістарычны факультэт БДУ, аспірантура Беларускай акадэміі мастацтваў, Беларускі калегіум (аддзяленне журналістыкі). Аляксей з'яўляецца сябрам ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны», ГА «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў», сябрам рэдакцыйнай калегіі газеты «Наша слова». У 1994 – 2021 гадах яго артыкулы пабачылі свет на старонках звыш трыццаці перыядычных выданняў. А. Шалахоўскі аўтар кніг «Польскі кавалер» (2010) і «Кальварыя. Гісторыя і сучаснасць» (2015).




І вось нядаўна ўбачыў свет яго зборнік публіцыстычных твораў «Сцежкамі гісторыка». Ён змяшчае тэксты, якія аўтар друкаваў у штотыднёвіку «Наша слова» цягам 2005 – 2020 гадоў. Кніга выйшла ў сталічным выдавецтве «Каўчэг» накладам 99 асобнікаў і мае важкі аб'ём у 215 старонак.

З'яўленне гэтага зборніка – адметная з'ява ў айчыннай культуры. Выданне фактычна ўяўляе сабой пярэстую мазаіку падзеяў з жыцця нацыянальнай супольнасці, што адбыліся цягам апошніх пятнаццаці гадоў. Кнігу складаюць рэпартажы з прэзентацыяў і выставаў, нататкі пра гісторыю, выяўленчае мастацтва, літаратуру, рэцэнзіі на кнігі, некралогі. Амаль у кожнага артыкула ёсць герой – беларускі творца, які сваім талентам і здабыткамі ўзбагаціў культурную спадчыну нашага народа. Таму кніга з'яўляецца важным дакументам-хронікай адметных падзеяў нацыянальнага жыцця і будзе запатрабаванай у грамадстве.

Пры ўсіх станоўчых якасцях выданне мае невялікі недахоп: у ім адсутнічае змест, што значна ўскладняе навігацыю па старонках. Паколькі кожны артыкул прысвечаны пэўнай асобе, то варта было б, напэўна, у канцы кнігі змясціць паказнік па персаналіях, што ўзмацніла б вартасць кнігі.

Спадзяюся, што Аляксей і найдалей застанецца летапісцам нацыянальнага культурніцкага жыцця і ў новым, дапоўненым і больш дасканалым выданні чытачы змогуць з задавальненнем прайсціся па «сцежках гісторыка» А. Шалахоўскага.

*Ігар ПРАКАПОВІЧ,*
*г. Паставы*

## Фотафакт

У рамках раённага этнапраекта «Народнаму скарбу – век векаваць» у аграгарадку Дварэц Дзятлаўскага раёна 24 сакавіка адбылося фальклорнае свята «Саракі». Традыцыйна яно звязанае з прыходам вясны, з праявдзеннем старажытных абрадаў і рытуалаў. Абрадавыя дзеянні прадэманстравалі ўдзельнікі дзіцячага клуба народных традыцыяў «Крыніца» Дварэцкага Дома культуры.

Адным з элементаў свята «Саракі» з'яўляецца традыцыя ўпрыгожваць рознакаляровымі стужкамі кола. Вясновае кола з рознакаляровымі стужачкамі сімвалізавала надзею, што неўзабаве ў наш край прыляцяць усе сорак птушыных чародаў, а сёлетні ўраджай будзе лепшым і багацейшым за леташні.

Хлопцы і дзяўчаты з задавальненнем вадзілі карагоды, гулялі ў «Чыжыка», збіралі сорак пруцікаў, гукалі птушак і частаваліся салодкім печывам.

*Марына ЛУКІЯНЕЦ,*
*загадчык аддзела метадычнай работы Дзятлаўскага РЦКіНТ*






# Харчаванне на Іўеўшчыне (1921 – 1939 гг.)

**(Працяг цыкла. Пачатак у №№ 9 – 13)**

У час посту распаўсюджанай стравай з рыбы быў студзень. Для яго рыба варылася цалкам. Цэлай яна захалоджвалася ў тым самым посудзе, у якім варылася. Ужывалі студзень з варанай гарачай бульбай.

Смачнай была рыба печаная. Яе ачышчалі, выпатрашвалі, мылі і крыху падсушвалі, каб не была мокрай. Салілі і густа пасыпалі каляндрай. На бляху клалі салому разам з сухімі галінкамі кропу, наверх рыбу і ставілі ў печ. Смачнай стравай была ікра. Яе салілі, абмаквалі ў муку і смажылі на патэльні. Ікра была ласункам для дзяцей.

Лавілі таксама ракаў, што былі ласункам для дзяцей. Лавілі іх хлопчыкі ўлетку. Гатаваць вельмі проста: абмытых ракаў кідаюць у кіпень, соляць і прыпраўляюць кропам. Варыць трэба да таго часу, пакуль не пачырванеюць. Затым ваду злівалі, а ракаў выкладвалі на стол, каб хутчэй астылі. Пасля іх ачышчалі і елі.

### *Рэцэпты продкаў*

**Карп з начынкай з грэцкай кашы**

*1 карп, 3 ст. лыжкі грэцкіх круп, 1 цыбуліна, 6 яек, 3 ч.л. масла, 500 г смятаны, соль, перац.*

Ачышчаную, выпатрашаную і вымытую рыбу салілі ўнутры і вонкі. Варылі грэцкую кашу, дадавалі абсмажаную цыбулю, на смак соль і перац, убівалі яйкі, перамешвалі. Кашай начынялі рыбіну (у тым ліку і галаву), выкладалі яе ў пасудзіну адпаведнай формы, улівалі смятану і трошкі вады. Тушылі ў печы цягам 1 гадзіны.

**Юшка з рыбы з бульбай**

*400 г свежай рачной рыбы, 1 морква, 1-2 цыбуліны, 3 бульбіны, соль, перац.*

Рыбу ачысціць ад лускі, выпатрашыць, пакласці ў каструлю, заліць халоднай вадой. Калі вада закіпіць, дадаць нарэзаныя кубікамі моркву, бульбу, цыбулю, соль, перац, варыць на невялікім агні да гатоўнасці.

**Карп, запечаны са смятанай**

*700 г карпа, 2 цыбуліны, 0,5 шклянкі смятаны, соль, перац.*

Падрыхтаваную рыбу нарэзаць кавалкамі, пасаліць, паперчыць, выкласці на патэльню, паміж кавалкамі рыбы пакласці цыбулю, нарэзаную кружкамі. Рыбу і цыбулю густа абмазаць смятанай і запякаць у гарачай духоўцы 30-40 хвілінаў.

**Запяканка з рыбы**

*500 г рыбы (карп), 500 г бульбы, 4-5 ст. лыжак алею, 3 шклянкі смятаны, 2 цыбуліны, 3 ст. лыжкі мукі, соль, перац, зяленіва.*

Падрыхтаваную рыбу парэзаць на кавалкі, пасыпаць соллю, перцам, укачаць у муку і абсмажыць на алеі з абодвух бакоў. Памытую бульбу зварыць, абабраць, здрабніць на буйной тарцы. Асобна абсмажыць дробна нарэзаную цыбулю.

У жароўню, змазаную алеем, пакласці палову падрыхтаванай бульбы, на яе – кавалкі рыбы, пасыпаць цыбуляй, зверху – зноў слой бульбы. Усё паліць смятанай і рэштай алею. Запякаць у духоўцы (ці ў печы) 30 хвілінаў.

Перад падачай на стол запяканку парэзаць на кавалкі, пасыпаць дробна нарэзаным кропам.

*Іван ЗАХАРЭВІЧ,*
*г. Іўе*




*Рыбная крама*

## Красавік

**14 – Нікіцін Віктар Дзмітрыевіч** (1951, Брэст), заслужаны архітэктар Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

**16 – «Пралеска (Дашкольная адукацыя)»** (Мінск; 1991), штомесячны навукова-метадычны ілюстраваны часопіс – 30 гадоў з часу стварэння.

**17 – Іванова Софія Паўлаўна** (1921 – ?), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**17 – Радзівілаў Уладзімір Генадзьевіч** (1961, Узда), артыст гутарковага жанру, парадыст, заслужаны артыст Беларусі – 60 гадоў з дня нараджэння.

**18 – Ларчанка Барыс Міхайлавіч** (1941, Мінск – 1994), заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР (1987) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**18 – Лявон Гмырак** (сапр. **Бабровіч Мечыслаў**; 1891, Докшыцкі р-н – 1915), крытык, пісьменнік, публіцыст – 130 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч** (1881, Камянецкі р-н – 1931), вучоны-гісторык, акадэмік НАН Беларусі і АН Украіны, першы прэзідэнт НАН Беларусі, грамадскі і палітычны дзеяч – 140 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Волкаў Валянцін Віктаравіч** (1881 – 1964), жывапісец, педагог, народны мастак Беларусі – 140 гадоў з дня нараджэння.

**22 – Спірыдовіч Алена Барысаўна** (1961, Мінск), дыктар беларускага тэлебачання, заслужаная артыстка Беларусі – 60 гадоў з дня нараджэння.

**27 – Кернога Мікалай Захаравіч** (1941, Баранавічы – 2009), журналіст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**27 – Міхась Башлакоў** (**Міхаіл Захаравіч**; 1951, Гомельскі р-н), паэт, выдатнік друку Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2008), Літаратурнай прэміі Баяна (2004, Расія) – 70 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Кісялёў Уладзімір Мікалаевіч** (1931, Пухавіцкі р-н – 2021), краязнаўца, заслужаны работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

**29 – Мікола Ермаловіч** (**Мікалай Іванавіч**; 1921, Дзяржынскі р-н – 2000), вучоны-гісторык, літаратуразнаўца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992) – 100 гадоў з дня нараджэння.

**30 – Сустава Наталля Уладзіміраўна** (1951), кніжны графік, аўтар ілюстрацыяў да многіх дзіцячых кніг – 70 гадоў з дня нараджэння.

***Шаноўныя чытачы, падпісчыкі!***

**Наступны нумар «Краязнаўчай газеты» выйдзе *23 красавіка*.**

### *У тэатры «Зніч»*

**12 красавіка** маленькіх гледачоў тэатр запрашае на лялечны монаспектакль **«Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага»** паводле п'есы Пятра Васючэнкі і Сяргея Кавалёва. Выканаўца – вядучы майстар сцэны Вячаслаў Шакалідо. Спектакль-казка прысвечаны прыгодам двух паноў, якія нічога не рабілі. Гаспадарка ў іх у заняпадзе – ні жывёлы, ні хлеба. І пайшлі яны ў свет лепшай долі шукаць...

**Увечары** пакажуць паэтычны монаспектакль **«Не праклінай, што я люблю»** паводле вершаванага рамана Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр-пастаноўшчык – Галіна Дзягілева, выканаўца – вядучы майстар сцэны Мікалай Лявончык, музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай (цымбалы).

Вершаваны раман «Родныя дзеці» – твор самабытны, глыбока нацыянальны і паводле духу, і паводле моўных сродкаў. Даследчык беларускага фальклору, побыту, тонкі знаўца жывой народнай гаворкі, Н. Гілевіч стварыў своеасаблівую паэтычную сюіту, дзе гарманічна зніто́ўваюцца гумарыстычныя ноты і пранікнёная, шчымлівая музыка кахання, чуюцца напевы роднай зямлі...

**14 красавіка** дзеці паглядзяць монаспектакль **«Мой маленькі прынц»**, што грунтуецца на вядомай аповесці-казцы Антуана дэ Сент-Экзюпеоы (пераклад Ніны Мацяш). Аўтар інсцэніроўкі і рэжысёр-пастаноўшчык – Галіна Дзягілева, выканаўца – вядучы майстар сцэны Раіса Астрадзінава.

«Зоркім можа быць адно толькі сэрца», – так сказаў маленькі хлопчык, які прыляцеў на Зямлю з астэроіда, каб знайсці сабе сябра. Але апынуўся ў пустыні. Мудрая казка пісьменніка-лётчыка актуальная і сёння.

**19 красавіка** дзетак запросяць на лялечны монаспектакль-гульню Лявона Мікіты **«Казачная торба»**. Аўтар і выканаўца – Леанід Сідарэвіч, пастаноўка і лялькі Галіны Карбаўнічай, сцэнаграфія і касцюмы – Алесі Снапок-Сарокінай, кампазітар Уладзімір Прохараў.

Што ж знаходзіцца ў казачнай торбе дзядзькі Пагуляя? Пра гэта можна даведацца, пагледзеўшы вясёлы спектакль пра звычайную, на першы погляд, торбу, якая ў руках Пагуляя робіцца чароўнай. А ў той торбе знаходзяцца лялькі-цацкі, якія закручваюць сюжэт з гульнямі ды танцамі.

**У гэты ж дзень** вечарам – паэтычны монаспектакль **«Не праклінай, што я люблю»** паводле вершаванага рамана Ніла Гілевіча «Родныя дзеці».

**21 красавіка** для дарослых прадставяць драматычны монаспектакль **«Кроткая»** паводле аднайменнага твора Фёдара Дастаеўскага. Рэжысёр-пастаноўшчык, аўтар інсцэніроўкі, выканаўца – Вячаслаў Шакалідо, кампазітар – Алег Залётнеў, сцэнаграфія народнага мастака Беларусі Барыса Герлавана.

Спектакль перадае атмасферу Пецярбурга канца XIX стагоддзя і раскрывае гісторыю – сямейную, спавядальную, пра тое, як складана бывае пачуць адно аднаго... Гэта гісторыя сутыкнення двух самалюбстваў і стрычанай магчымасці шчаслівага кахання.

**26 красавіка** дзеці пабачаць лялечны монаспектакль Лявона Мікіты **«Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»**. Выканаўца – Леанід Сідарэвіч, рэжысёр-пастаноўшчык Галіна Карбаўнічая, мастак – Таццяна Лісавенка.

Што застаецца рабіць кату Сафрону, калі злая Мачаха выгнала яго з роднай хаты? Адно выйсце: ісці ў белы свет шчасця шукаць. Але, каб яго знайсці, трэба гэта заслужыць – прайсці праз горы і даліны, праз балоты і лагчыны, у цёмным лесе не заблукаць і не спужацца, кінуцца ў вадаварот, каб выратаваць сябра, сусешыць яго – і моцна падружыцца...

Увечары **28 красавіка** пакажуць монаспектакль **«Нобіль – Барвяны Уладар»** паводле аповесці Уладзіміра Караткевіча «Сівая легенда». Аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр і выканаўца – Вячаслаў Шакалідо.

XVII стагоддзе на Беларусі прынята лічыць смутнымі часамі. У. Караткевіч дае слова швейцарцу Конраду Цхакену, наёмнаму ваяру ў Рэчы Паспалітай. І яго распавед-маналог ператвараецца ў легенду аб нашым народзе.

*Дзіцячыя прадстаўленні адбываюцца а 15-й гадзіне, дарослыя – а 19-й.*

***Спектаклі праходзяць у тэатральнай зале Культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне: 331-75-53.***

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**ПУБЛІЦЫ́СТЫКА** (ад лац. publicus грамадскі) – від твораў, прысвечаных актуальным праблемам і з'явам грамадскага жыцця. Скіраваная на аператыўнае асэнсаванне рэчаіснасці (пераважна сучаснасці) шляхам спалучэння лагічнага і эмацыйна-вобразнага спосабаў даследавання і адлюстравання жыцця. Спецыфічным чынам удзельнічае ў працэсах дзяржаўнага, грамадскага і гаспадарчага кіраўніцтва, актыўна ўздзейнічае на ход практычных справаў ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці. Выконвае важныя сацыяльна-педагагічныя, прапагандысцкія, інфармацыйныя функцыі, служыць сродкам фармавання грамадскай думкі, вострай зброяй ідэйнай барацьбы. Асабліва пашырэнне мае ў журналістыцы – як від грамадска-палітычнай літаратуры. Пісьменніцкая публіцыстыка прасякнутая кампанентамі мастацкай творчасці.

**ПУБЛІЦЫСТЫ́ЧНЫ СТЫЛЬ** – адзін з функцыянальных стыляў мовы, што выкарыстоўваецца сродкамі масавай камунікацыі, у газетах, грамадска-палітычных і літаратурна-мастацкіх часопісах, у агітацыйна-прапагандысцкіх выступленнях.

Публіцыстычны стыль ажыццяўляе функцыю эмацыйнага ўздзеяння. Яму ўласцівыя спецыфічныя моўныя сродкі, абумоўленыя мэтамі і прынцыпамі адбору гэтых сродкаў у сферы грамадска-палітычнай дзейнасці: грамадска-палітычныя тэрміны, эмацыйна-ацэначныя словы, экспрэсіўна-звязаныя словазлучэнні, перыфразы, фразеалагізмы.

**ПУЗЫ́НА (Puzynina) Габрые́ля** (24.09.1815, в. Дабраўляны Смаргонскага раёна – 16.08.1868) – польская пісьменніца. У 1850-я – 1860-я гг. жыла ў Нястанішках (Смаргонскі раён) і Гарадзілаве (Маладзечанскі раён). Аўтар зборнікаў вершаў «У імя Бога» (1843), «Далей у свет» (1845), «Прозай і вершам» (1856), «Проза і вершы» (1857). У кнізе «Малыя, але праўдзівыя апавяданні» (1857) з гуманістычна-асветніцкіх пазіцыяў адлюстравала грамадскія канфлікты, з павагай намалявала тыпы сялянаў. Выдала кніжку замалёвак «Літоўскія дзеці, іх слоўцы, адказы, назіранні» (1847), дзе выявіла паэтычны свет дзяцей беларускай вёскі. Зборнік «Аматарскі тэатр» (1861) склалі камедыя «Ці прыгожая, ці багатая» і драматычны абразок «За горадам», якія з поспехам ставіліся ў Вільні. Аўтар успамінаў «У Вільні і ў літоўскіх дварах» (Вільня, 1928). Зберагала аўтографы Я. Чачота, Т. Зана, А. Адынца, В. Поля, С. Манюшкі, Уладзіслава Сыракомлі, Г. і Ю. Вяняўскіх, І. Ходзькі, Я. Ходзькі і інш.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамасны – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ПУЧЫНСКІ.
Адказны сакратар Алесь Сачанка.
Рэдкалегія: Уладзімір Гілеп (старшыня), Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Радзім Гарэцкі, Ганна Запартыка, Павел Каралёў, Алесь Карлюкевіч, Аляксандра Кравец, Ігар Пракаповіч, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі, Аляксандр Суша.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283-28-26.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары дописаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры передруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 08.04.2021
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 139.
Тыраж 410 асобнікаў.